**Ермалёнак, В. А.** Сядзіба ў Крычаве / В. А. Ермалёнак // Памяць: Міёрскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. М. Маняк [і інш.] ; уклад. Л. А. Матэленак ; рэд. В. І. Марціновіч ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – С. 571–572.

## СЯДЗІБА Ў КРЫЧАВЕ

Вёска Крычава з'яўляецца адным з самых старажытных паселішчаў раёна. Упершыню ўзгадваецца яна ў дакументах пачатку XVI ст. як уладанне Зяновічаў. У 1522 г. Крыцовічы (так тады называлася Крычава) набывае Пётр Масальскі. Пад канец XVII ст. вёска перайшла да Міхала Рудаміны, які меў герб «Труба». Але ўжо ў 1721 г. яго сын Аляксандр прадае набытыя бацькам землі Францішку Невянглоўскаму, які ўзначальваў войска Браслаўскага павета. Новы ўладальнік паходзіў з мазавецкіх князёў гербу «Ястраб», жанаты быў на мясцовай княгіні Мірскай. Пасля маёнтак перайшоў да малодшага сына Тадэвуша, гусарскага харужага і дэпутата 1770 г. на літоўскі трыбунал. Ён быў жанаты на Багуміле Шауман. Так як два старэйшыя сыны Тадэвуша не мелі нашчадкаў, Крычава дасталася самаму малодшаму Фердынанду, старшыні памежнага суда Дзісенскага павета. Ён быў жанаты на Ганне Левандоўскай. Іх сын Ігнат атрымаў у спадчыну не толькі маёнтак, але і пасаду старшыні памежнага суда. Ад яго шлюбу з Эдвінай Рудніцкай не было сыноў, таму Крычава ў другой палове XIX ст. пераходзіць ва ўладанне Федаровічаў, бо дачка Міхаліна выйшла замуж за Норберта Федаровіча. Апошнім уладальнікам Крычава стаў Уладзіслаў Федаровіч (1876–1943). Па ўспамінах браслаўскага старасты З. Януковіча, гэта быў вельмі паважаны ў павеце гаспадар, які карыстаўся павагай не толькі заможных жыхароў, але і сялян. Ён адзін з першых у гэтых мясцінах адмовіўся ад сервітутаў і бязвыплатна перадаў гэтыя землі крычаўскім сялянам. У гаспадарцы яму дапамагала вельмі энергічная і дзелавая жонка. Сам ён любіў займацца садам, кветкамі і развядзеннем дрэў, якімі былі абсаджаны ўсе дарогі маёнтка. Сядзіба заўсёды ўтрымлівалася ў чысціні і парадку, яе гаспадары славіліся добразычлівасцю і гасціннасцю.

Сядзіба, якая была разбурана пасля апошняй вайны, пабудавана, верагодна, у другой палове XVIII ст. Тадэвушам Невянглоўскім. Велічны, прасторны, выцягнуты з захаду на ўсход будынак з дрэва ўвасобіў у сабе асноўныя рысы класіцызму. Праўда, галоўны жылы дом быў перабудаваны ў 1880 г. Бакавыя флігелі разабралі, але замест іх Федаровіч дабудаваў тры пакоі з аднаго боку, а з другога – кухню і службовую. У час археалагічнай разведкі юныя археолагі выявілі на месцы сядзібы падмурак склепа з надпісам «1898 год», які таксама складаў з будынкам адно цэлае.

Аб знешнім выглядзе пабудоў мы можам даведацца з запісаных у 1887 г. успамінаў Уладзіслава Мікеля і са здымкаў 30-х гадоў, якія захаваліся. Цэнтральная частка будынка была на высокім каменным падмурку. Фасад яго меў шырокі порцік з двума радамі калон і па абодвух баках невялікія верандачкі, якія таксама трымаліся на калонах. Сцены былі шаляваныя. Вокны, дзверы і калоны пафарбаваны ў белы колер. Дах шырокі чатырохсхільны, крыты гонтай. Дом змяшчаў гасціную, тры вялікія жылыя пакоі, налева шырокі калідор з зімовым садам дзяліў вялікі і малы салоны, пакой для гасцей, будуар, сталовую і буфет. Некалькі малых пакояў служылі для адміністрацыі і гаспадарчых патрэб. Сцены іх тынкаваныя, часткова паклеены шпалерамі. Падлога паркетная, печы з каляровай кафлі, былі два каміны, адзін з іх, у сталовай, з цэглы, атынкаваны і пафарбаваны ў белы колер, другі, у будуары, аздоблены гіпсам у стылі ракако.

Да 1914 г. у сядзібе было шмат антыкварыяту, мэблі. Спальня і будуар былі абстаўлены ў стылі ракако, пераважна мясцовымі майстрамі, у іншых памяшканнях – з чырвонага дрэва ў стылі ампір, у кабінеце – бідэрмеер (аўстра-германскі стыль першай паловы XIX ст., падабенства ампіру). Сустракалася мэбля з ясеню, інкруставаная чорным дубам. На сценах было шмат карцін, у тым ліку выдатныя копіі італьянскіх мастакоў XV–XVI стст., копія Смакоўскага карціны французскага мастака К. Маленэра «Першы пацалунак». Былі нават тры акварэлі славутага Дэлакруа. Выдатны партрэт Норберта Федаровіча ў дзіцячыя гады невядомага аўтара.

У кабінеце знаходзіўся кнігазбор літаратуры пераважна на гістарычную тэматыку XIX ст., але былі і рэдкія выданні папярэдніх стагоддзяў, старадрукі. Знаходзілася шмат вырабаў з парцэляны. Асабліва каштоўныя старадаўні французскі белы сервіз для снедання, упрыгожаны бурбонскімі лілеямі, для белай кавы, расійскі сервіз майстра Гарднера для чорнай кавы на 12 асоб, яшчэ больш старажытны, але разукамплектаваны чорны з кветкамі англійскі абедзенны сервіз. Асаблівае захапленне ў калекцыянераў выклікала ліловая масленіца са старой польскай парцэляны ў выглядзе галубка. Уладальнікі сядзібы падаравалі для народнага музея ў Варшаве старадаўні сярэбраны кубак на два літры з гербам Невянглоўскіх. У 30-я гады ў Браслаўскі музей падараваны слуцкі пояс, шыты залатымі і сярэбранымі ніткамі.

У наведвальнікаў выклікалі цікавасць французскі габелен і турэцкі дыван.

Частку старажытных рэчаў прывезлі ў свой новы маёнтак яшчэ Невянглоўскія, людзі высокай культуры. Шмат сабраў іх у час вандровак па Еўропе і Турцыі Норберт Федаровіч. Які лёс гэтых збораў? Частка была падзелена паміж дзецьмі. Бібліятэка згарэла ў часы ліхалецця 1917–1920 гг. Рэштка разрабавана і знішчана ў 1939 г.

Цікавым архітэктурным помнікам сядзібы быў свіран XVIII ст., пабудаваны на высокім падмурку з каменя, меў шырокія каменныя прыступкі, пад'езд упрыгожвалі шэсць калон, дах крыты гонтам. Будыніна нагадвала загадкавы палац.

Побач з сядзібай існавала капліца – шэдэўр драўлянага дойлідства. Але калі царскія ўлады захацелі перарабіць яе на царкву, па загадзе Эдвіны Невянглоўскай будыніну разабралі за адну ноч. На яе месцы паўстаў пахавальны фамільны склеп. Зараз тут засталіся толькі вялікія дрэвы ды адзінае надмагілле Невянглоўскіх.

Парку сядзіба ў Крычаве не мела, але былі кветнікі, алеі для прагулак, абсаджаныя ліпамі, грабам, дубамі, зараснікі бэзу, якія прыгожа глядзеліся над маляўнічымі сажалкамі.

В. А. Ермалёнак